## I. Пазнайце гістарычны партрэт дзеяча па апісанню.

### Партрэт № 1.

**У 2013 годзе спаўняецца 480 годоў** з дня нараджэння чалавека, які зрабіў значны ўклад ва ўмацаванне Рэчы Паспалітай, спрыяў падняццю яе аўтарытэту ў Еўропе. Умацаваў армію, дзеля чаго стварыў першае войска для аблог і штурмаў крэпасцей, якое набіралася з замежных жаўнераў-наёмнікаў. Прывёў Інфлянцкую вайну да задавальняльнага для Рэчы Паспалітай выніку.

Сваю рэзідэнцыю ён трымаў у Гародні, у Старым замку. З-за таго, што прычына яго смерці выклікала спрэчку паміж прыдворнымі медыкамі, было праведзенае першае на тэрыторыі Усходняй Еўропы анатамаванне трупа гродзенскім цырульнікам Янам Зігуліцам (14 снежня 1586).

### Партрэт № 2.

**У 2013 годзе спаўняецца 285 годоў** з дня нараджэння беларускага асветніка і астранома. У 1753-54 вывучаў філасофію ў Віленскім універсітэце. Тут ён зацікавіўся астраноміяй і для ўдасканалення ведаў накіраваўся ў Пражскі універсітэт. Астранамічную практыку праходзіў у абсерваторыях Марселя, Авіньёна і Неапаля. Вярнуўшыся ў Вільню, дзе атрымаў тытул магістра філасофіі і свабодных навук, ён стаў арганізатарам і першым дырэктарам (1765-1807) Віленскай астранамічнай абсерваторыі. З 1764 працаваў прафесарам Віленскай езуіцкай акадэміі, якую ў 1780 рэарганізаваў у Галоўную школу Вялікага княства Літоўскага і быў яе рэктарам.

### Партрэт № 3.

**2 лютага 2013г. спаўняецца 175 гадоў** з дня нараджэння нацыянальнага героя беларускага народу - рэвалюцыянера-дэмакрата, аднаго з кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863–1864 гг., мысліцеля, публіцыста, паэта. Супольна з паплечнікамі выдаваў нелегальную беларускую газету “Мужыцкая праўда”. Этапнай з’явай у гісторыі беларускай літаратуры сталі яго публіцыстыка (“Лісты з-пад шыбеніцы”), вершы (“Марыська, чарнаброва галубка мая”, прысвечаны Марыі Ямант, і “Калі за нашу праўду Бог нас стаў караць” – развітанне з беларускім народам).

**Партрэт № 4.**

**У 2013 годзе спаўняецца 165 годоў** з дня нараджэння прыродазнаўцы і вынаходніка, доктара медыцыны, прафесара. Скончыў Мінскую гімназію, працягваў вучобу ў Парыжы, Фларэнцыі, Вене. Арганізаваў у сваім маёнтку метэаралагічную станцыю, зрабіў значныя адкрыцці ў галіне метэаралогіі (вымярэнне хуткасці руху воблакаў, вільготнасці глебы і інш.) і за гэта ўзнагароджаны сярэбраным медалём Рускага геаграфічнага таварыства. Адкрыў у сваім маёнтку санаторый, распрацаваў метады лячэння нервовых захворванняў электрычным токам, метад электраграфіі для дыягностыкі захворванняў, выкарыстоўваў кумысалячэнне, святлолячэнне, гімнастыку, мясцовыя мінеральныя воды.

**Партрэт № 5.**

**У 2013 годзе спаўняецца 280 годоў** з дня нараджэння вядомага палітычнага і грамадскага дзеяча Вялікага княства Літоўскага, асветніка на Беларусі і ў Літве. Заснаваўшы дзесяткі мануфактур і навучальных установў, ён стварыў і свой тэатр, у які запрашаў балетмайстраў, замежных артыстаў, музыкантаў, спевакоў і харэографаў, у тым ліку братоў Г. і Л. Петынеці з Неапаля. Тэатр, які пачынаўся з невялікага ансамбля інструментаў і вакалістаў, да 1778 дасягнуў высокага прафесійнага ўзроўню і стаў шматпрофільным. На яго сцэнах былі ажыццёўлены пастаноўкі оперы А.Грэты "Магніфік", камедыі П.Бамаршэ "Севільскі цырульнік". Вёў перапіску з Ж.Ж.Русо і прапаноўваў яму пераехаць у Гродна або ў Белавежскую пушчу.

**II. Аб’яднайце па пэўных катэгорыях прозвішчы выбітных еўрапейцаў, якія адзначаюць у 2013 годзе круглую дату.**

Мікалай Капернік, Джордж Гордан Байран, Стэндаль, Вінцэнт Ван Гог, Джаванні Бакачча, Дэні Дзідро, Яраслаў Гашак, Іаган Брамс, Рыхард Вагнер, Ян Матэйка, Фрэдэрык Гарсіа Лорка, Поль Гаген, Альбер Камю, Эрых Марыя Рэмарк, Франц Кафка, Джэймс Олдрыдж, Франсуа дэ Ларошфуко, Адам Кіркор, Джузэпэ Вердзі, Альфрэд Нобель, Джо Дасэн, Адам Міцкевіч

**Пісьменнікі:**

**Кампазітары:**

**Паэты:**

**Мастакі:**

**Філосафы:**

**Спевакі:**

**Навукоўцы:**

**Вынаходнікі:**

**III. У 2013 годзе святкуецца 95 гадоў з даты ўтварэння дэмакратычных рэспублік, паўстаўшых у 1918 годзе падчас разбурэння імперый і стварэння нацыянальных дзяржаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе пасля першай сусветнай вайны.**

**Суаднясіце назву сучаснай краіны і палітычныя ўстановы і прозвішчы дзеячоў.**

| | | |
|---|---|---|
| 1. Літва | a) II Rzeczpospolita | I. М.Грушэўскі |
| 2. Беларусь | b) Tautas padome | II. Т.Масарык |
| 3. Польшча | c) Prvá republika | III. К.Ульманіс |
| 4. Венгрыя | d) УНР | IV. Ф.Эберт |
| 5. Чэхія і Славакія | e) Rat der Volksbeauftragten | V. I.Серада |
| 6. Аўстрыя | f) Eesti Ajutine Valitsus | VI. М.Кароі |
| 7. Латвія | g) Magyar Népköztársaság | VII. Ю.Пілсудскі |
| 8. Германія | h) БНР | VIII. К.Пятс |
| 9. Эстонія | i) Republik Österreich | IX. К.Рэнер |
| 10. Украіна | j) Lietuvos Taryba | X. А.Смятона |

**IV. Еўропа прайшла складаны шлях да аб’яднання ў ЕС. У гэтым годзе можна вылучыць наступныя памятныя даты. Даведайцеся больш аб гісторыі інтэграцыйных еўрапейскіх працэсаў.**

**Працягніце далей.**

1. **1713** Шарль-Ірэнэ Кастэль дэ Сэн-П’ер выдаў у Утрэхце сваю працу, пасутнасці, першую абгрунтаваную прапанову еўрапейскага адзінства дзеля дасягнення міру на кантыненце. Яна называлася --------------------.

2. У кастрычніку **1923** Рыхард Кудэнховэ-Калергі выдаў у Вене сваю кнігу, якая заклала падставы цяперашняй еўрапейскай ідэі, еўрапейскай самасвядомасці і еўрапейскай ідэнтычнасці. Яна называлася ------------.

3. 27-28 жніўня **1943** у Мілане Альц’ера Спінэлі стварыў Рух еўрапейскіх федэралістаў, праграмай якога стаўся так званы “Маніфэст Вентатэнэ”. Сапраўдная назва дакумента ------------------.

4. 1 студзеня **1948** набыла моц дамова аб стварэнні ----------------------. Бельгіі, Нідэрландаў і Люксембургу – Бенілюксу.

5. 16 красавіка **1948** створаная Арганізацыя еўрапейскай эканамічнай супрацы, якая аб’ядноўвала 17 еўрапейскіх краін, што бралі ўдзел ў Плане ---------------------.

6. 1 студзеня **1958** набыла моц Рымская дамова 1957 г. аб стварэнні -------

7. 22 студзеня 1963 у Парыжы была падпісана Елісейская дамова аб сяброўстве паміж Францыяй і Германіяй, якая стварыла саюз паміж гэтымі двума дзяржавамі і забяспечыла трываласць ЕС. Яе падпісалі: --

8. 1 студзеня **1973** адбылося **“**першае пашырэнне”. Чальцамі ЕЭС сталі краіны: ------------------.

9. 1 верасня **1988** набыла моц Еўрапейская хартыя -----------------------.

10. 1 лістапада **1993** набыла моц ------------------------.

**V. Рашыце гістарычную задачу.**

**Задача № 1.**

У гэтым годзе святкуецца 700 гадоў з дня нараджэння гэтага славутага італьянскага паэта, дзеяча ранняга Адраджэння, і 490 гадоў з дня выдання ў Кракаве знакамітага твора, напісанага ў Рыме выбітным дзеячам беларускага Адраджэння і прысвечанага ВКЛ.

**Пытанні:**

1. 700-гадовы юбілей з дня нараджэння якога італьянскага паэта святкуецца ў гэтым годзе і як называецца самы знакаміты твор гэтага паэта?
2. Які выбітны дзеяч беларускага Адраджэння напісаў свой знакаміты твор у Рыме і выдаў у Кракаве 490 год назад?Як называецца гэты твор?
3. Якой славутай італьянцы прысвечана гэта выданне?

**Задача № 2.**

У гэтым годзе нарадзіліся мастак Эдвард Мунк і заснавальнік алімпійскага руху П’ер дэ Кубертэн, у Амерыцы падпісаны дэкрэт аб вызваленні рабоў і пачалася Грамадзянская вайна, у Англіі заснавана першая футбольная асацыяцыя і адчынена першая лінія метро.

**Пытанне:**

1. А што ў гэтым годзе адбывалася ў Беларусі?
2. Назавіце не менш за тры падзеі з розных сфер жыцця грамадства.

**Задача № 3.**

- 690 год таму гэты горад стаў сталіцай буйной еўрапейскай дзяржавы;
- 425 год таму там быў выданы самы прагрэсіўны на той час у Еўропе кодэкс норм права на беларускай мове;
- 100 гадоў таму ў гэтым горадзе была пастаўлена п'еса Янкі Купалы "Паўлінка"

**Пытанні:**

1. Аб якім горадзе ідзе размова?
2. Які кодэкс быў выданы 425 год таму?
3. А хто яшчэ з славутых беларусаў пакінуў след у гісторыі гэтага горада?

**Задача № 4.**



Гэта мініяцюра добра ілюструе важную падзею, якая адбылася на трэці год пасля славутай Грунвальдскай бітвы і за два гады да Канстанцкага сабору.

(Тая падзея, якой уласна прысвечана мініяцюра, адбылася амаль на сто гадоў пазней і нас не цікавіць у гэтай задачы).

**Пытанні:**

1. Як называецца гэта падзея?
2. Які юрыдычны дакумент яе замацоўвае?
3. Колькі гадоў назад гэта адбылося?

**Задача № 5.**

У гэтым годзе адбыліся значныя падзеі для італьянцаў, партугальцаў ды беларусаў. Аб іх нам сведчаць наступныя артэфакты (глядзі выявы). Паглядзіце на іх уважліва ды напішыце год, у якім адбыліся падзеі. А каб было цікавей, напішыце год не арабскімі лічбамі, якія на самай справе ёсць перанятыя індыйскія лічбы, а рымскімі. Раім карыстацца табліцай рымскіх лічбаў. Жадаем поспеху!



Привилей Месту Полтавскому на право
Магдебурское вечные вольности

Бо много речей смешиваются в единое время старостю понем-
в забытии людскіе которые с природоженія своего памяти малою
пріятствы не были бы вечными, и тому свидетельство приходит будучие
мости не были прибеглими. Прото, неоспоримо есть то: руками
Мы, Александр, Божою милостию великий князь Литовский, Русский, Жомойт-
ский. Пану Всем ... Чиним знаменито сим нашим листом на
дому нашему ... потреба і и хранити нынешним и напотом будучим



| Roman Numeral Table | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1** | I | **14** | XIV | **27** | XXVII | **150** | CL |
| **2** | II | **15** | XV | **28** | XXVIII | **200** | CC |
| **3** | III | **16** | XVI | **29** | XXIX | **300** | CCC |
| **4** | IV | **17** | XVII | **30** | XXX | **400** | CD |
| **5** | V | **18** | XVIII | **31** | XXXI | **500** | D |
| **6** | VI | **19** | XIX | **40** | XL | **600** | DC |
| **7** | VII | **20** | XX | **50** | L | **700** | DCC |
| **8** | VIII | **21** | XXI | **60** | LX | **800** | DCCC |
| **9** | IX | **22** | XXII | **70** | LXX | **900** | CM |
| **10** | X | **23** | XXIII | **80** | LXXX | **1000** | M |
| **11** | XI | **24** | XXIV | **90** | XC | **1600** | MDC |
| **12** | XII | **25** | XXV | **100** | C | **1700** | MDCC |
| **13** | XIII | **26** | XXVI | **101** | CI | **1900** | MCM |

MathATube.com